# Прафесія: ляснічы

Хто такі ляснічы? Трэба ўдакладніць, што ляснічы і ляснік - розныя прафесіі і не варта іх блытаць. Леснік - іншымі словамі, гэта вартаўнік лесу, у яго ёсць свае лясныя ўчасткі, за якімі ён даглядае, сочыць, каб на гэтай тэрыторыі не было незаконных высечак, захламленасці і т. д. **Ляснічы** ж - гэта той чалавек, які кіруе лясной гаспадаркай у цэлым.



Гэта не значыць, што ляснічага не цікавіць ахова лесу, гэтая частка клопату аб лясной гаспадарцы таксама яго датычыцца, але апроч гэтага ляснічы сочыць за тым, дзе можна высякаць лес, а дзе не варта, дзе трэба пасадзіць новы лес. Яму трэба своечасова падрыхтаваць насенне і высадкі, абраць месцапасадкі, арганізаваць людзей. *Гэта вельмі важная работа, у выніку якой замест пустыні вырастае новы лес.* Іншымі словамі, ляснічы займаецца лясной гаспадаркай, лесаўпарадкаваннем.

Сочыць ляснічы і за здароўем лесу , своечасова адсочвае прыкметы хвароб дрэў, такіх як з'яўленне казурак-шкоднікаў, грыбоў-паразітаў. І ў выпадку наступлення небяспекі, прызначае санітарную рубку -

рубку, якая дазваляе выдаліць хворыя дрэвы, і тым самым не дапусціць паражэнне здаровых.

Ляснічы кіруе леснікамі, майстрамі лесу і іншымі работнікамі лясніцтваў, а сам падпарадкоўваецца галоўнаму лясні чаму. Для добрай працы ляснічаму патрэбны глыбокія веды, набыць якія можна атрымаў вышэйшую адукацыю.



Самы галоўны мінус працы ляснічага - тое, што вынікі працы не бачныя адразу. Пасадзіўшы ў зямлю маленечкія высадкі, трэба чакаць як мінімум гадоў 30-40, каб убачыць лес, які вырас на месцы пусткі. Але з іншага боку, такі лес будзе цешыць не адно пакаленне.

Прафесія ляснічага падыдзе таму, хто любіць прыроду, хто цікавіцца раслінным і жывёльным светам, экалогіяй, хто не схільны цэлымі днямі працаваць за кампутарам.

***<u>Ляснічы</u>*** *- важная і патрэбная прафесія, якая дорыць нам радасць любавацца лясамі і дыхаць свежым паветрам.*

*Матэрыял падрыхтаваў: мл. навуковы супрацоўнік Валошына А.Р.*